**З 21 па 22 мая** ў Мінску прайшлі **XV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні**, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, якія арганізавалі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускі экзархат Рускай праваслаўнай царквы, Інстытут тэалогіі імя святых Кірылы і Мяфодзія Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірылы». Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р. Матульскі выступіў з дакладам «Праваслаўныя цэрквы і бібліятэкі: агульная гісторыя, агульны лёс». У рамках мерапрыемства адбылася канферэнцыя «Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга», дзе разглядаліся пытанні ўзаемадзеяння публічных і царкоўных бібліятэк па духоўна-маральным выхаванні на праваслаўных традыцыях, выхавання цікавасці чытачоў да праваслаўнай літаратуры, духоўнасць і праблемы дзіцячага чытання ды інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ